# РАЗДЗЕЛ III
# ПРАБЛЕМЫ ЭТНАЛОГІІ, АНТРАПАЛОГІІ, ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ І СЛАВІСТЫКІ

*Аўсейчык У. Я.*

## ДЭМАГРАФІЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў СТАРАВЕРАЎ ПАЎДНЁВА-ЎСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 2-Й ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 16.12.2020)*

Адным з рэгіёнаў кампактнага пражывання рускіх стараверaў з'яўляецца паўднёва-ўсходняя частка Беларусі. Крыніцы сведчаць аб пасяленні стараверaў на гэтых землях яшчэ ў сярэдзіне XVII ст. У наступным гэты рэгіён стаў адным з важнейшых цэнтраў стараверства ва Усходняй Еўропе. Дадзены артыкул прысвечаны разгляду дэмаграфічных працэсаў у асяроддзі стараверaў паўднёва-ўсходняй Беларусі ў 2-й палове XIX – пачатку XX ст. У межах адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу гэтага перыяду рэгіён складаюць паўднёва-ўсходнія паветы Мінскай губерні (Бабруйскі, Ігуменскі і Рэчыцкі), а таксама цэнтральная і паўднёвая частка Магілёўскай губерні. У тэрытарыяльныя межы даследавання не будуць уваходзіць паўночныя землі Мінскай (Барысаўскі павет) і Магілёўскай (Сенненскі і Аршанскі паветы) губерняў, на якіх у адзначаны перыяд фіксавалася значная колькасць прадстаўнікоў старога абраду. Але гэтыя тэрыторыі адносяцца да паўночна-ўсходняй зоны рассялення стараверaў у Беларусі.

Асноўная маса стараверaў рэгіёна была сканцэнтравана на тэрыторыі Гомельскага, Рагачоўскага і Магілёўскага паветаў Магілёўскай губерні, Бабруйскага і Ігуменскага паветаў Мінскай губерні (табліцы 1-2). У рэгіёне пражывалі як старавeры-папоўцы (пераважна Белакрыніцкага пасвячэння), так і беспапоўцы. У Гомельскім павеце налічвалася невялікая колькасць і беглапапоўцаў.

Табліца 1

| Павет | Колькасць стараверaў у паветах Мінскай губ. па гадах (чал.) | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1863 | 1871 | 1877 | 1887 | 1891 | 1894 | 1897 | 1905 | 1913 |
| Бабруйскі | 2498 | 3232 | 3849 | 7908 | 7952 | 9711 | 9353 | 10380 | 12626 |
| Ігуменскі | – | – | 47 | 783 | 900 | 995 | 1583 | 1900 | 2180 |
| Рэчыцкі | 40 | – | 52 | 88 | 88 | 334 | 387 | 387 | 390 |

Складзена на аснове: [1, с. 87; 3, с. 34; 9, с. 22-29; 10, с. 10; 11, с. 232; 12, с. 262; 13, с. 3; 14, с. 126; 15, с. 72; 28, с. 78].

Табліца 2

| Павет | Колькасць старавераў у паветах Магілёўскай губ. па гадах (чал.) | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1875 | 1883 | 1888 | 1893 | 1897 | 1905 | 1914 |
| Гомельскі | 11426 | 14404 | 14448 | 15101 | 14964 | 20887 | 28137 |
| Рагачоўскі | 1058 | 965 | 1280 | 1455 | 1751 | 1236 | 827 |
| Магілёўскі | 189 | 324 | 442 | 690 | 972 | 1040 | 1328 |
| Чэрыкаўскі | 121 | 174 | 163 | 173 | 167 | 136 | 370 |
| Чавускі | – | – | – | 205 | 309 | 366 | 543 |
| Быхаўскі | 10 | 13 | 13 | 50 | 249 | 234 | – |

Складзена на аснове: [4, с. 80; 6, с. 32; 18, с. 72; 19, с. 386; 22, с. 148; 26, с. 46; 27].

Тэрыторыя Гомельскага павета з'яўлялася адным з гістарычных цэнтраў старaверства на беларускіх землях. У межах павета знаходзіўся духоўны цэнтр стараверaў-папоўцаў – мястэчка Ветка. Згодна з афіцыйнымі данымі, у 1859 г. у павеце налічвалася 12 971 старавераў. Праз два гады іх колькасць вырасла да 14 999 чалавек [16, с. 14 – 22; 17, с. 72 – 73]. Але на працягу 1860-х – 1-й паловы 1870-х гадоў колькасць старавераў у павеце паменшылася. У 1875 г. налічвалася толькі 11 426 чалавек (табліца 2). Найбольш хуткімі тэмпамі вырасла колькасць старавераў у пачатку XX ст. З 1897 г. да 1914 г. яна павялічылася амаль у два разы (табліца 2). У Гомельскім павеце таксама пражывала значная колькасць аднаверцаў, што асабліва істотна павялічылася ў пачатку XX ст. Так, у 1903 г. у павеце налічвалася 150 аднаверцаў, у 1909 г. – 524, у 1914 г. – 889 [21, с. CX; 25, с. 12; 26, с. 46].

Другім па колькасці старавераў у рэгіёне быў Бабруйскі павет Мінскай губерні. У 1858 г. у ім налічвалася 2 285 старавераў [9, с. 22 – 29]. У наступным колькасць прадстаўнікоў старога абраду ў павеце павялічвалася. На мяжы стагоддзяў яна дасягнула 9 353 чалавекі, а ў 1913 г. – 12 626 чалавек (табліца 1). Шмат старавераў пражывала на тэрыторыі Ігуменскага павета Мінскай губерні. Калі ў канцы 1870-х гадоў колькасць старавераў на гэтай тэрыторыі была зусім невялікай, то ўжо з сярэдзіны 1880-х гадоў яна істотна ўзрастае. Згодна з перапісам насельніцтва 1897 г., у павеце налічвалася 1 583 старaверы, а ў 1913 г. – 2 180 (табліца 1).

Да лідараў па колькасці старавераў у рэгіёне належаў таксама Рагачоўскі павет. У 1859 г. тут налічвалася 708 старавераў. У наступныя дзесяцігоддзі іх колькасць паступова расла. У 1875 г. яна перавысіла тысячу чалавек (табліца 2), а ў 1894 г. дасягнула 1 501 чалавекі. Аднак з канца XIX ст. назіраецца зніжэнне колькасці старавераў у павеце. У той жа час тут расце колькасць аднаверцаў, якая ў 1909 г. перавысіла колькасць старавераў. Такая ж тэндэнцыя захоўвалася і да 1914 г. На гэты год колькасць старавераў у павеце складала 827 чалавек, а аднаверцаў – 1 113 чалавек [16, с.14 – 22; 7, ведамасць 12; 25, с. 12].

Значная частка стараверскага насельніцтва пражывала на тэрыторыі Магілёўскага павета. Але толькі ў канцы XIX ст. яго колькасць дасягнула

тысячы чалавек (табліца 2). У Чэрыкаўскім і Чавускім паветах Магілёўскай губерні, а таксама Рэчыцкім павеце Мінскай губерні старавераў пражывала даволі мала. У Чавускім павеце стараверскага насельніцтва да канца 1880-х гадоў увогуле не фіксаваліся. У Рэчыцкім павеце фактычна да канца 1870-х гадоў усе старавераы жылі ў павятовым цэнтры, і толькі з 1890-х гадоў іх колькасць нязначна ўзрастае. У Быхаўскім павеце колькасць прадстаўнікоў старога абраду была нязначнай. Некаторае павелічэнне ў колькасці назіраецца толькі ў 1890 – пачатку 1900-х гадоў (табліца 2). У Горацкім і Мсціслаўскім паветах Магілёўскай губерні ў 2-й палове XIX – пачатку XX ст. стараверaў увогуле не было зафіксавана. На тэрыторыі Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні да пачатку XX ст. яны таксама не фіксаваліся. Аднак і ў пачатку XX ст. іх колькасць была зусім невялікай (максімальна дасягнула 24 чалавек у 1905 г.) [22, с. 148].

Такім чынам, статыстычныя даныя пераканаўча сведчаць пра ўстойлівае павелічэнне колькасці стараверскага насельніцтва ў рэгіёне. Яно тлумачыцца пераважна натуральным прыростам насельніцтва. Гэты фактар указваўся і ў афіцыйных статыстычных справаздачах таго часу. Разам з тым, крыніцы сведчаць пра дастаткова актыўную міграцыю стараверскага насельніцтва ў рэгіёне. Гэтым можна патлумачыць істотныя змены ў колькасці і складзе стараверскага насельніцтва на працягу невялікага прамежку часу. У той жа час выпадкі пераходу ў стараверства мясцовага, пераважна праваслаўнага, насельніцтва былі даволі рэдкімі. Афіцыйная статыстыка прыводзіла звесткі аб пераходзе стараверaў у праваслаўе, але і яны не былі масавымі.

Большасць стараверскага насельніцтва рэгіёна ў 2-й палове XIX – пачатку XX ст. пражывала ў сельскай мясцовасці; асноўная колькасць стараверскага гарадскога насельніцтва – у Гомелі. У астатніх гарадах стараверaў жыло мала. Нават у губернскім горадзе Магілёве іх да 1890-х гадоў амаль не налічвалася. І толькі ў 1890-я – пачатку 1900-х гадоў тут заўважаецца некаторае павелічэнне стараверaў: у 1893 г. – 97, у 1895 г. – 102, у 1897 г. – 107, у 1903 г. – 92 стараверы. Але ў 1904 – 1905 гг. назіраецца істотнае зніжэнне колькасці стараверaў у горадзе. Так, у 1904 г. іх налічвалася ўсяго 30 чалавек, а ў 1905 – 14. У наступным іх колькасць некалькі павялічваецца. У 1914 г. у Магілёве налічвалася 154 чалавекі [19, с. 386; 20, с. 134; 21, с. CX; 26, с. 46; 27, с. 94 – 95]. Невялікая колькасць стараверaў пражывала таксама ў Рагачове. У горадзе ў 2-й палове XIX – пачатку XX ст. адзначаецца паступовы рост стараверскага насельніцтва. У 1914 г. тут пражывала 168 чалавек [26, с. 46]. У іншых павятовых гарадах рэгіёна (Чэрыкаве, Чавусах, Мсціславе, Горках, Клімавічах, Быхаве) стараверaў амаль не фіксавалася.

У 1859 г. у гарадах Магілёўскай губерні пражывала 3 149 стараверaў, што складала 20,6% ад усяго стараверскага насельніцтва губерні і 4,4% ад агульнай колькасці гараджан губерні. Лідарам па колькасці стараверaў быў горад Гомель з прадмесцем Беліцай. Тут пражывала 3 114 стараверaў, што складала 99% ад усяго гарадскога стараверскага насельніцтва губерні. У

структуры гарадскога насельніцтва Гомеля стараверы складалі 25%, крыху пераўзыходзячы праваслаўнае насельніцтва і саступаючы толькі яўрэям [16, с. 14 – 22]. З 1859 г. па 1861 г. колькасць старавераў-гараджан у Магілёўскай губерні вырасла да 5 218 чалавек. У агульнай структуры стараверскага насельніцтва доля старавераў-гараджан павялічылася да 30%. Рост колькасці гарадскога насельніцтва абумоўлены яго павелічэннем у Гомелі і Беліцы. За два гады стараверскае насельніцтва тут вырасла больш чым на 67% і склала 5 182 чалавек. Павялічылася і доля старавераў у структуры насельніцтва Гомеля і на 1861 г. склала звыш 30%. У іншых жа гарадах губерні колькасць старавераў за гэтыя два гады амаль не змянілася [17, с. 73].

За 1860 – 1870-я гады колькасць стараверскага гарадскога насельніцтва ў Магілёўскай губерні істотна скарацілася. Так, у 1888 г. налічвалася 2 062 чалавек, што складала каля 10,5% ад усяго стараверскага насельніцтва губерні. Амаль усе яны пражывалі ў Гомелі. У горадзе налічвалася 2 020 старавераў, што складала каля 7% ад усяго насельніцтва [18, с. 72 – 73]. У 1890-я гады колькасць гарадскога стараверскага насельніцтва ў Магілёўскай губерні павялічвалася, але яго доля ў агульнай колькасці старавераў губерні заставалася прыкладна на адным узроўні. У 1893 г. яна складала 12%, у 1895 г. – 10,6%, у 1897 г. – 8,4% [19, с. 386; 20, с.134; 27, с. 94 – 95].

Асабліва істотны рост гарадскога стараверскага насельніцтва ў Магілёўскай губерні адбыўся з 1906 па 1907 гг. Колькасць старавераў-гараджан у губерні вырасла з 2 619 у 1906 г. да 6 229 у 1907 г. (з іх 6 004 у г. Гомелі), а ў працэнтных суадносінах доля павялічылася з 9% да 18,8% [23, дадатак 3; 24, с. 50]. У наступныя гады колькасць гарадскога стараверскага насельніцтва таксама павялічвалася. Так, у 1909 г. у губерні налічвалася 7 059 старавераў-гараджан, у 1914 г. – 9 229. На 1914 г. у Магілёўскай губерні 24% стараверскага насельніцтва пражывала ў гарадах. Лідарам сярод гарадоў быў Гомель, дзе жыў 8 831 старавер (каля 96% ад усяго гарадскога стараверскага насельніцтва губерні і каля 23% ад агульнай колькасці старавераў губерні) [25, с. 12; 26, с. 46].

Сярод гарадоў усходняй часткі Мінскай губерні стараверы пражывалі толькі ў Бабруйску і Рэчыцы. У Ігумене іх амаль не фіксавалася. Так, у 1858 г. у Бабруйску пражывала 347 старавераў, што склала каля 15% ад усяго стараверскага насельніцтва павета і каля 1,5% ад усіх жыхароў горада Бабруйска. У 1863 г. колькасць старавераў у горадзе вырасла да 397 чалавек (16% ад усяго стараверскага насельніцтва павета). Аднак у 1870-я гады доля старавераў-гараджан у Бабруйскім павеце зменшылася да 6-7% і на такім узроўні захоўвалася да канца XIX ст. Так, у 1877 г. у Бабруйску налічвалася 258 старавераў, у 1887 г. – 475, у 1891 г. – 551, у 1894 г. – 595. З канца XIX ст. доля гараджан у агульнай масе старавераў Бабруйскага павета памяншаецца да 4%. Так, у 1897 г. у Бабруйску налічвалася 342 стараверы, у 1905 г. – 403, у 1913 г. – 548. У Рэчыцы колькасць старавераў на працягу 2-й паловы XIX – пачатку XX ст. заставалася амаль нязменнай. Так, у 1858 г. у горадзе налічвалася 56 чалавек, у 1877 г. – 52, у 1887 г. – 49, у 1891 г. – 52, у 1897 г. – 55, у 1905 г. – 55, у 1913 г. – 56 [1, с. 87; 3, с. 34; 9, с. 22 – 29; 10,

с. 10; 12, с. 262; 14, с. 126; 15, с. 72; 28, с. 78].

Як сведчаць статыстычныя даныя, сярод стараверскага насельніцтва рэгіёна ў 2-й палове XIX – пачатку XX ст. у асноўным назіралася колькасная перавага жанчын над мужчынскім насельніцтвам. Але ў шэрагу адміністрацыйных адзінак і населеных пунктаў фіксавалася і перавага мужчынскага насельніцтва. Асабліва гэта датычыцца гарадскога стараверскага насельніцтва Магілёва, Бабруйска, Рэчыцы і Рагачова. Найбольш істотная перавага мужчынскага насельніцтва фіксавалася ў Магілёве. Дадзены факт можна патлумачыць спецыфікай гаспадарчай дзейнасці. Разам з тым, па асобных гадах зафіксавана невялікая перавага мужчынскага стараверскага насельніцтва і ў паветах. У першую чаргу гэта датычыцца Рэчыцкага павета, дзе на працягу ўсяго перыяду адзначалася перавага мужчынскага насельніцтва. Так, згодна з данымі перапісу 1897 г., у Рэчыцкім павеце (без уліку горада) пражывала 193 мужчыны і 139 жанчын. Па асобных гадах фіксавалася нязначная перавага ў Магілёўскім і Бабруйскім паветах. Так, у 1897 г. Магілёўскім павеце (без уліку горада) пражывала 453 мужчыны і 412 жанчын. А ў 1913 г. у сельскай мясцовасці Бабруйскага павета налічвалася 6 109 мужчын і 5 969 жанчын [15, с.72; 27, с. 94; 28, с. 78].

Для аналізу дэмаграфічных працэсаў важным паказчыкам з’яўляецца ўзровень пісьменнасці. Пры характарыстыцы стараверскай супольнасці рэгіёна значная колькасць крыніц сведчыць пра дастаткова нізкі ўзровень адукаванасці старавераў рэгіёна. Але пры гэтым крыніцы 2-й паловы XIX – пачатку XX ст. паведамляюць пра паступовы рост навучэнцаў з ліку старавераў нават у агульнаадукацыйных школах. У першую чаргу гэта датычылася старавераў-папоўцаў Гомельшчыны. Так, у «Аглядзе Магілёўскай губерні» на 1882 г. адзначалася, што «ў апошні час назіраецца, што раскольнікі <…> дзяцей сваіх адпраўляюць для навучання ў народныя вучылішчы, нават у Гомельскую прагімназію» [5, с. 17]. Тэндэнцыя да павелічэння колькасці навучэнцаў з ліку старавераў адзначаецца і па Мінскай губерні. У 2-й палове XIX ст. крыніцы сведчылі пра дастаткова нізкую колькасць дзяцей старавераў, якія навучаліся ў агульных школах. Але пры гэтым у іх адзначалася, што ў мінулым сітуацыя была яшчэ горшай: «Імкненне да адукацыі сярод іх прасоўваецца вельмі туга і ў справаздачным годзе [1878] сярод выхаванцаў навучальных устаноў не налічвалася і дзясятка стараабрадцаў, але ў мінулыя гады і гэтага не назіралася» [2, с. 86].

Згодна з данымі перапісу 1897 г., узровень пісьменнасці сярод стараверскага насельніцтва Магілёўскай губерні быў невысокі. Ён складаў каля 15% ад усяго насельніцтва, у тым ліку 25,6% у мужчын і каля 5,4% у жанчын. Гэты паказчык мала адрозніваўся ад агульнага па губерні (25,8% у мужчын і 8,42% у жанчын). Узровень пісьменнасці ў старавераў быў вышэйшы, чым у праваслаўнага насельніцтва губерні, але ніжэйшы, чым у пратэстантаў, іудзеяў і католікаў. Сярод гарадскога стараверскага насельніцтва ён быў значна вышэйшы чым у сельскіх жыхароў. Так, сярод сельскага стараверскага насельніцтва узровень пісьменнасці складаў 13,3% (у мужчын – 23,5%, жанчын – 4,3%), а сярод гарадскога – 33,3%. Сярод

гарадскога стараверскага насельніцтва узровень пісьменнасці быў параўнальна высокім як у мужчын (каля 46%), так і ў жанчын (19,3%) [27, с. 100].

Некалькі адрозніваліся даныя па ўзроўні пісьменнасці ў асобных паветах. Так, у Магілёўскім павеце ён складаў 14,5% (у мужчын – 24%, жанчын – 2,1%), Гомельскім – 17,3% (у мужчын – 29,8%, жанчын – 6,6%), Рагачоўскім – 16% (у мужчын – 28,5%, жанчын – 4,6%), Рэчыцкім – 17,8% (у мужчын – 25%, жанчын – 8%) [27, с. 104, 108, 120; 28, с. 104, 108]. У той жа час даволі нізкім быў узровень пісьменнасці сярод старавераў Бабруйскага і Ігуменскага паветаў Мінскай губерні. Так, у Ігуменскім павеце узровень пісьменнасці склаў 8,3% (у мужчын – 16,3%, жанчын – 0,5%). А ў Бабруйскім павеце на 1897 г. доля пісьменных старавераў складала толькі 6,2%. Зусім нізкая доля зафіксавана сярод жаночага насельніцтва. Калі ў мужчын яна склала 12%, то ў жанчын – усяго 0,8% [28, с. 88, 92, 96].

Такім чынам, у 2-й палове XIX – пачатку XX ст. рэгіёнамі кампактнага рассялення стараверскага насельніцтва былі тэрыторыі Гомельскага, Бабруйскага, Ігуменскага, Рагачоўскага і Магілёўскага паветаў. За гэты перыяд назіраецца істотнае павелічэнне колькасці старавераў у рэгіёне. Большасць стараверскага насельніцтва тут складалі сельскія жыхары, але значная частка пражывала і ў гарадах (Гомелі, Бабруйску, Магілёве і Рагачове). Узровень адукаванасці стараверскага насельніцтва мала адрозніваўся ад агульнага ў рэгіёне (толькі ў старавераў Бабруйскага і Ігуменскага паветаў ён быў ніжэйшым).

**ЛІТАРАТУРА**


1. Обзор Минской губернии за 1877 г. – Минск : Губернская тип., 1878. – 2, 150, 82 с.
2. Обзор Минской губернии за 1878 г. – Минск : Губернская тип., 1879. – 2, 164, 106 с.
3. Обзор Минской губернии за 1891 г. – Минск : Губернская тип., 1892. – 4, 50, 53 с.
4. Обзор Могилёвской губернии за 1875 г. – Могилёв: [б. и.], 1876. – 172, 67 с.
5. Обзор Могилёвской губернии за 1882 г. – Могилёв: [б. и.], 1883. – 4, 29, 54 с.
6. Обзор Могилёвской губернии за 1883 г. – Могилёв : [б. и.], 1884. – 4, 44, 31 с.
7. Обзор Могилёвской губернии за 1894 г. – Могилёв: Тип. губернского правления, 1895. – 2, II, 54, 2, II, 167 с.
8. Обзор Могилёвской губернии за 1911 г. – Могилёв : Губернская тип., 1913. – VI, 115, 161 с.
9. Памятная книжка Минской губернии на 1860 г. – Минск : Тип. губернского правления, 1859. – 155, 112 с.
10. Памятная книжка Минской губернии на 1865 г. – Минск : Губернская тип., 1864. – 234, 57 с.
11. Памятная книжка Минской губернии на 1873 г. – Минск : Губернская тип., 1872. – 293 с.
12. Памятная книжка Минской губернии на 1889 г. – Минск : Губернская тип., 1888. – 349, III с.
13. Памятная книжка Минской губернии на 1896 г. – Минск : Типо-литография

Х. Дворжеца и Б. Соломонова, 1895. – XLIV, 294, 88, 26 с.
14. Памятная книжка Минской губернии на 1907 г. – Минск : Губернская тип., 1906. – 200, 207, III с.
15. Памятная книжка Минской губернии на 1915 г. – Минск : Губернская тип., 1914. – 232, 185, III с.
16. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1861 г. – Могилёв: Тип. губернского правления, 1861. – 18, 34, 106, 115, 144, 52, 8 с.
17. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1863 г. – Могилёв : Тип. губернского правления, 1862. – 236, 106, XI с.
18. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1890 г. – Могилёв : Тип. губернского правления, 1890. – 464 с.
19. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1895 г. – Могилёв : Тип. губернского правления, 1890. – 467, LII с.
20. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1897 г. – Могилёв : Тип. губернского правления, 1897. – X, 306, XXV, 365, 5 с.
21. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1905 г. – Могилёв : Типо-литография Я. Н. Подземского, 1905. – 51, LXXVII, 353, CC, 50 с.
22. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1907 г. – Могилёв : Тип. губернского правления, 1906. – 302, 151, V с.
23. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1908 г. – Могилёв : Губернская тип., 1907. – XXVIII, 283, 112 с.
24. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1909 г. – Могилёв: Губернская тип., 1909. – XL, 375, XXXIV, 88, 92 с.
25. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1911 г. – Могилёв : Губернская тип., 1911. – IV, 294, 59 с.
26. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1916 г. – Могилёв : Губернская тип., 1916. – XVI, 256, X, 69, 72 с.
27. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Слово, 1903. – Вып. 23. Могилёвская губерния. – 4, XVI, 276 с.
28. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Тип. Санкт-Петербургской тюрьмы, 1904. – Вып. 22. Минская губерния. – 4, XVI, 243 с.

РЕЗЮМЕ

В статье рассмотрены демографические процессы у старообрядцев юго-восточной Беларуси во 2-й половине XIX – начале XX в. Проанализированы особенности расселения в регионе, прослежена динамика количества населения, проанализировано соотношение сельских и городских жителей. В статье также проанализирован уровень грамотности и половой состав старообрядческого населения региона.

SUMMARY

The article deals with the demographic processes among the Old Believers of South-Eastern Belarus in the second half of the XIX century and the beginning of the XX century. The peculiarities of settlement in the region are analyzed, the dynamics of population number is traced, the ratio of rural and urban residents is analyzed. The article also analyzes the literacy level and gender composition of the Old Believer population in the region.